Вольная Беларусь

Цэна асобнаго № 15 кап.

Умовы падпіскі на 1917 г.

За 1 м.	За 2 м.	За 3 м.	За 4 м.	За 5 м	За 6 м.	За 7 м.	За 8 м	За 9 м.
1 р	2 р.	3 р	4 р.	5 р.	6 р.	7 р.	8 р.	9 р.

Падпіска прымаецца толькі с 1-го чысла кожнаго месяца

Перамена адрэсу—50 коп. Пры зьмені адрэса конча прыкладаць стары адрэс.

Рукапісы павінны быць чытэльна напісаны і толькі з аднаго боку паперы. Кепска напісаныя рукапісы ні чытацца, ні друкавацца ні будуць.

На ліставанне, перасылку рукапісаў і іншыя адказы-павінны прыкладацца маркі.

Газэта палітычная, экономічная і літэратурная.

Год выданьня I.

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: Мінск, Захараўск. 18

Умовы друку абвестак:

(На IV боку газэты) за 1 радок шпальту 40 к. за 2 рад. 80 к. за кожны раз.

Асобам, шукаючым працы — 1 руб. за 3 р дкі за адзін раз.

№ 29. 1917 г. Аўторак. Выходзіць двойчы на тыдзень. 14 лістапада 1917 г. № 29.

Таварышы і грамадзяне!

На выбарах да Устаноўчага Сойму па Міншчыні і Віленшчыні галасуйце за сьпісак

№ 13. Беларускай Социялістычнай Грамады. № 13.

Сучасны момэнт.

Падзеі адбываюцца з голавакружачай шпаркасьцю. На дзевятым месяцу волі Расія, апанованая руйнуючым агнём анархіі, апынулася ў становішчу новае рэвалюцыі, новаго змагання. Улады німа. Ніхто ні пэвян сёдня, што здарыцца заўўтра. Дзяржаўная машына круціцца, тарахціць, як да шчэнту сапсованы гадзіннік. Разлад расьце, разбухае і шырыцца. Разгойданыя хвалі грамадзкаго руйнавання захлынулі сабою усё людзкое жыццё.

Восім месяцаў волі прайшлі у безглуздым распальванні злосьці, восім месяцаў патрачано на палоханне контр-рэвалюцыяй. У клясавой ненавісьці, у руйнаванні здабыткаў рэвалюцыі, бачылі мэту рэвалюцыі, ядывае заданне, патрэбу і ратунак дэмакратыі. У цёмныя, забітыя, поўныя гневу, масы шпурлялі, як пылаючыя махнушы, лёзунгі і заклікалі ні да працы, ні да творчай работы, а на руйнаванне народам здабытаго грамадзкаго дабра. Расійская дэмакратыя, пад сьцягам каторай адбываліся усе падзеі рэвалюцыйнаго часу, як бы адчуваючы уласное безсілле, мэрам наўмысьля, толькі тое і рабіла, каб спраўдзіць словы: хоць дзень, але мой. Ясна, што с цэнтру ратунак ні прыдзе. Украінцы, Сібір, малдаване і усе іншыя арганізованыя народы Расіі парвалі зносіны с цэнтрам і горача узяліся за грамадзянскае адбудаванне кожны паасобку. Адна Беларусь маўчыць, толькі яна чагось жджэ, на штось спадзяецца. Усе народы Расіі з жахам адхіснуліся ад таго, што робіцца ў Петраградзі, адна Беларусь ні можа парваць з заразным і безнадзейна хворым арганізмам. Прыступіць да захавання свайго краю ад загібелі—яшчэ ні значыць аддзяліцца, і беларускаму грамадзянству пара кінуць старыя забабоны і нібаўна пачаць працу па адбудаванню свайго краю коштам уласных сіл і захадаў. Гэтага вымагае ад нас сучасны момэнт,—добрабыт, росквіт і доля нашае айчыны; да гэтага валае нас патрэба уласнаго захавання і страх перад тым горам, сьлязьмі і грамадзянскім заніпадам, што чакаюць нас у будучыні, калі у свой час ні ужыць патрэбных захадаў. Гэты час настаў, гадзіна дванастая прабіла...

Анарахічная зараза, нахлынуўшая на нас с цэнтру, ахапіла увесь наш край ад краю да краю. Штодня прыносяцца жахлівыя вестк,—што пагромы, гвалт і руйнаванне разліліся па ўсёй шырокай Беларусі. Панскія маёнткі, лясэ, садыбы, усё грамадзкое дабро паліцца, крышыцца, нішчыцца, або псуецца на векі. Гіне скарб, пустошыцца край, гарыць народнае дабро. І хто-ж дасьць ратунак нам, як ні мы самі? Хто дапаможа нам, калі кожын затурбован сабою? Украіна гасіць пажар сама і цераз моро бушуючаго агніска падае нам раду ўласнаго ратавання.

Вялікая Беларуская Рада—айчына ў нібезпецы! На сьцені Белае Русі паўстаў покліч айчыны: паўстаньце усе, як адзін —ратуйце свой край ад згінення!

Я. Л—к.

Падзеі апошняго часу.

Хто такія большэвікі?

У канцы лістападу [з 24-25 лічбу] у Петраградзі пачалося паўстанне, ініцыятарамі, або павадырамі каторага зьяўляюцца большэвікі і прыхільныя да іх элямэнты. Вялікую трагэдыю перажывае ціпер дзяржава Расійская. На гарадох і іншых людных цэнтрах адбываюцца вялікія, гістарычнае вагі, падзеі, каторыя адабьюцца больш значнымі пераменамі, як зрабіла рэвалюцыя палітычная, выклікаеная панованнем царызму. Большэвікі падпялі паўстанне, жадаючы рашучых перамен у сацыяльным грамадзкім ладзі. Яны намагаюцца скінуць грамадзкі лад, цабудованы на праві ўласнасьці, і збавіцца ад панавання багатых і заможных, утварыўшы дыктатуру (ўладарство) працоўнаго люду, або пролетарыяту. Пра гэтыя падзеі і пра большэвікоў, распачаўшых справу, можна пачуць ціпер скрозь. Большэвікі у ўсіх і кожнаго ціпер на вуснах, але бадай рэдка хто зможа даладно адказаць на запытанне, хто яны такія—большэвікі?

Большэвікамі завуцца тыя людзі, каторыя трымаюцца пагляпаў ліваго крыла расійскай социял-дэмакратычнае работніцкае партыі. Заргапізаваўшыся у 1898 г. на першым сваём зьездзі, расійская социялдэмакратычная работніцкая партыя ужо на другом зьездзі у 1903 г. раскалолася на дзьве часьці (фракцыі), меньшую, па ліку прэдстаўнікоў зьезду, і большую. Сябрукі меньшае фракцыі сталі звацца меньшэвікамі, а большае—большэвікамі. На чале большэвікоў сталі у той час Ленін (Ульяноў) і Плеханоў, а павадыром меньшэвікоў быў Мартоў. Плеханоў перайшоў потым да мень-

* * *

Люд стогне, сумуе пад ценжаром меча,
Скаваў яго сэрцо гарачае лёд...
Адкрыты дарогі табе, чалавеча,
На захад, на поўнач, на поўдзень, на ўсход.
Ты вольны, нібога: ідзі, куды хочаш:
Я даў табе сілы ярэмма пабіць,
Даў чуткія вушы, арліныя вочы,
Я даў табе душу і сэрцо—любіць...
Вы зьбіліс з дарогі, вас ноч ахапіла,
Арліныя вочы патухлі у вас,
І водзіць вас ў полі нічыстая сіла,
Агонь ў вашым сэрцы пагас...
Аб чым жа сумуеш, бедак, ніспакойны?
Акінь сваім вокам грыгожую даль.
Ахамяніся—будзь сын Мой дастойны,—
І радасьць пазнаеш, адкінеш свой жаль...

Якуб Колас.

НАВУКА.

Казаў настаўнік мне—ён блізкі быў Прароку,
Які жывым узьняўся ў выш, ў блакіт нябескіх сфэр—
«Мой сын, с начатку мы пад'ўладны пану-Року—
«У гэта вер.
«Які-бы крыж табе ні выпаў у жыцці гэтум:
«Галеці век, чы быць царом і царскі мець пасад,
«У балоце бросьнеці, чы йсьці к нізнаным мэтам,
—«Яго загад.
«І вось, калі табе трываць ні хопіць змогі,
«І цяжкім здасца крыж табе, і доля вельмі злой,—
«Ні трэба, сын, шукаць лягчэйшае дарогі,—
«Ідзі старой.
«І мусіць час настаць: убачыш сьвет праменны,—
«Ідзець ўладар адвечны твой, яго спаткай здалёк.
«Увьдзеўшы бітвы меч на свой пояс раменны.
«І скажа Рок:
«Ідзі хутчэй слуга! Спавіты сьвет маркотай.
«У ім крыўды легіон забраў зямлі апошню чвэрць.
«Нясі ж свой праўдзе меч.»—«Мой сын!—ідзі з ахвотай
«На чэсьць і сьмерць.»

Алесь Гарун.

АМЭРЫКАНІЦ.

Заможны фэрмер штата Гільлінойса, Максім Балазевіч, з дыліжансам ехаў з места дамоў, на фэрму.

Ужо пачынало змрочыць, калі падьехаў дыліжанс да бакавой дарожкі, што ішла ад шоссэ да фэрмы. Балазевіч, чырвоны і разьюшаны ад гутаркі с падарожнымі, праехаў бы міма, каб батрак Язэп, што пільнаваў яго побач шоссэ пад старым дрэвам ля дрожак, ні падбег і ні крыкнуў:

— Пане Балазевіч, стойце!..

Фурман спыніў коні. Папярэдная парка тупацела нагамі і бразгала збруёю, ніцярпліва сморгаючы вожкі; задняя была спакайней, і аграмадная, на вялікіх колах, з адчыненымі вокнамі, карэта стала. Памоцнік фурмана адкінуў драбінкі-сходні і палез па вузенькай лесьнічцы на вышкі адвязываць пакункі.

Прыемная вячэрняя прахалода гарнула с-пад прыгожых прыдарожных аллеяў і з бульбянаго поля на брукаваную, роўную, нібы ток, высокую дарогу. Лягчэй уздыхалі падарожныя, адзін пан Максім мала прыкмечаў, што ужо вечар і халадней; яму было душна. Мала прыкмечаючы людзей і ўсё, што сам робіць, ён каторы раз і з імі разьвітаўся і усё яшчэ гаманіў аб тое, нат ні добра вымаўляючы ў абурэнню па-ангельску і ні клапоцячы аб тым:

— Не, містэр Круке,—казаў ён:—гэта толькі нашая прызвычка і німагчымасьць стануць вышэй ад яе... Раз я амэрыканьскі грамадзянін, я ні павінян і ні маю права пазіраць на Амэрыку, як на нейкі этап на шляху вышуканьня лепшай долі ранейшай бацькаўшчыні.

А містэр Круке соты раз запаліваў цыгару, бліскаючы на ганаровую грубую даму з зыбкім пяром на шляпцы і с сабачкам-вужэлачкам на ўлонях, і на голенага сівога пана з доўгімі польскімі вусамі.

— Я ж ні кажу,—соп ён:—што Амэрыка—гэта толькі мая магчымасьць багацець і выраблянь на найлепшае у сьвеці маю ранейшую бацькаўшчыну, але ж маю поўнае права спагадаць людзям, сярод каторых жыў мой дзед і чыя кроў цячэ у ва мне. І гэта—калі я амэрыканіц.

— Так, мой пане, так,—памагаў яму пан с польскімі вусамі;—а калі я пакінуў дзедаўшчыну толькі дзеля тое, каб знайсьці спосабы адрадзіць яе, то як я маю ні спагадаць ёй,—што?..

— Ай, ні тое, ні тое,— хапаўся Балазевіч,— і я аб тым ні спрэчаюся, і я, можа, маю думку аб лепшай долі свае першае бацькаўшчыны, і можа... і можа іншы раз думаю і назад... туды, на бацькаўшчыну выехаць, але прынцыпіяльно—што гэта, што гэта? Хіба ні прызвычка толькі будзённай нісьвядомасьці думаць, што я от с тым лапікам на зямном клубку зьвязан навекі, што павінян клапаціць аб ім? Праз што? Праз прызвычку і ўспаміны, якія ні выйдуць ужо з галавы. І праз тое, што мы, што я—чалавек звычайны, слабы і ні магу змогчы гэных успамінаў, адарвацца саўсім, забыцца саўсім, калі мусіў пакінуць тэй лапік, мусіў эмігрырываць. А каб я быў вышэйшы чалавек, я здолаў бы паслухаць розуму і забыцца і ні мучыцца праз дурное, чулае сэрцо...

Ужо ён напрашчаўся трэцці раз; ужо фурман парыхтуваўся ехаць, а Язэп прывязаўшы багаж на дрожках, дзівіўся, што пан так зайшоўся. Нат грубая дама ні мела боляй цярплівосьці і праз сілу маўчала, а Максім усё яшчэ кіраваўся, як найлепі перакапаць тых:

— І вот дзеці, дзеці, што вырастаюць і гадуюцца тутака. Каб ім ні казаў пра тую бацькаўшчыну, ці яны б ведалі, што апрача Амэрыкі, ёсьць і яшчэ яна, і яшчэ аб ёй трэба клапаціцца?

Карэта загрымела па бруку. Заляскалі коні падковамі па каменню. Памочнік фурмана вясёла памахаў накіпутаму пасажыру брылям. І тады Балазевіч

шэвікоў, а далей пакінуў і гэтых, ды стаў трымацца асобных поглядаў, застаючыся соцыялдэмократам. За гэта рэшта с.-дэмократоў стала называць яго ліквідатаром, або, на іх думку, гасіцялем работніцкаго руху. Плеханоў лічыцца тэорэтыкам марксізму і настаўнікам расійскай с.-дэмакратыі. У наш час ён працуе у гуртку «Единство». Тэорэтыкам і павадыром большэвізму застаецца Ленін.

У 1905 року большэвікі склікалі трэйці зьезд партыі, і гэты зьезд толькі падкрэсьліў і мацней зазвачыў раскол. Адны глядзелі на жыцце і разумелі свае заданні гэтак, а другія інакш. Праўда, на чацьвёртым зьездзі, скліканным таго самаго году, пашанцавало часова палагодзіць гэты раскол, але ні на доўга. і фракцыі зноў разышліся, бо большэвікі былі занатта радыкальнаю часткаю с.-дэмакратыі, а меньшэвікі — занатта памяркоўнаю. Большэвікі трымаліся тае думкі, што трэба дамагацца адразу таго, што патрэбна працоўным людзям і што, наогул, вымагаецца іх партыйнымі заданнямі, а меньшэвікі, наодварот,—тыя ні згаджаліся з імі і тлумачылі, што так працаваць німагчыма, што трэба рахавацца з умовамі часу, ні гвалтаваць жыцця заўчасу, а лічыцца з яго паступовасьцю і ступнем развіцця.

Такім чынам, абедзьві фракцыі, маючы адну праграму, адны і тыя заданні, рожняцца перш за ўсё у тактыцы. У час царызму, большэвікі, у спрэчнасьць меньшэвікам, настайвалі на сьціслай цэнтралізацыі і ні уважалі магчымым, дзеля конспірацыі, заводзіць у сябе выбарныя партыйныя інстытуцыі. Гэта спачатку і было першаю прычынаю таго, што ў аднэй партыі істнувалі паралельна [побач] дзьве організацыі—большэвіцкая і меньшэвіцкая. Але далей—боляй. Потым кожная новая справа ці палітычны выступ, выклікалі новыя ніпрымірымыя спрэчкі. Так, большэвікі байкотавалі Д. Думу, адмоўляючыся працаваць з буржуазьяй, каб ні звужаць сваіх праграмных дамаганняў. Апошнімі часамі, калі разьюшылася эўропэйская вайна, большэвікі рашуча выступілі проці яе і ні зьмянілі свайго адношэння да яе нават посьля рэвалюцыі. Ужо ў 1905 г., падчас першае расійскае рэвалюцыі, большэвікі намагаліся установіць дыктатуру пролетарыяту і селянства, захапіўшы рэвалюцыйным чынам палітычную уладу, ні гледзючы на тое, што істнуваў яшчэ царызм, каторы здолаў потым пражыць яшчэ 12 год.

Большэвікі лічаць сябе старроннікамі чыстай клясовай лініі пролетарыяту і адкідаюць уселякія компрамісы, а меньшэвікі уважаюць магчымым супрацоўнічаць з буржуазьяй. Большэвікі, трымаючыся таго пагляду, што буржуазія ні можа быць чыннікам рэвалюцыі, як стан прывіляёвы у прамысловасьці і земляробстві,—уважаюць рэвалюцыю справай вылучна пролетарска-селянскаю. Праўда, у скасованні царату заінтэрасована была і буржуазія, але і толькі таго. Далейшы рух рэвалюцыі для багатых станаў зьяўляецца згубаю, бо яна скірована проці правоў пануючых станаў. Тым часам, работніцтво і селянство заінтэрэсованы у як найрадыкальнейшых палепшэннях, якія толькі мажлівы у варунках капіталістычнаго ладу. Іншаго погляду трымаюцца меньшэвікі. Яны тлумачаць, што буржуазія, будучы станам прогрэсіўным у эканамічным сэнсі, можа і мусіць быць чыннікам рэвалюцыйным. Адгэтуль вынік, што дэмократыя пры капілістычным ладзі ні можа абыйсьціся без супрацоўніцтва буржуазіі і іншых, прыхільных да іх, элямэнтаў. Рэвалюцыя была буржуазная, а затым і здабыткі яе павінны быць падзеляны паміж буржуазнымі станамі і дэмократыяй.

Большэвікі кажуць, што разам с палітычнай рэвалюцыяй [заваёванне вольнасьцяў] трэба рабіць і соцыяльную, бо покі, моў, сонцо ўзыдзе—раса вочы выясьць, а меньшэвікі стаяць за тое, што палітычная рэвалюцыя расчышчае толькі дарогу пролетарыяту дзеля змагання за соцыялізм, але для соцыяльнай рэвалюцыі яшчэ час ні настаў ні толькі у Расіі, а нават заграніцай, дзе грамадзкі лад і эканамічнае развіцце шмат вышэйшыя, як у нас. Такім чынам, кажуць яны, распачынаць у такой беднай і эканомічна адсталай дзяржаві, як Расія, соцыяльную рэвалюцыю—знача, выклікаць анархію, безладзе і культурны заніпад, а ў рэзультаці—страціць і тое, што здабыто праз рэвалюцыю палітычную. Соцыяльная рэвалюцыя магчыма толькі тагды, як капіталістычны лад, каторы пануе скрозь, вырасьце да таго ступня, што стане валтузіць жыцце усяго грамадзянства, як гэта было с самадзяржаўным, царскім ладам у палітычным быту людзей. Царызм трымаўся, покі ні зжыў сябе, а як прышоў час, дык разваліўся, як спарахнелае, трухлявае дрэво.

Трэба зазначыць, што як выбухла цяперашняя вайна, дык соцыялісты усіх нацый і краёў падзяліліся на абаронцаў і інтэрнацыяналістаў. Усе абаронцы кажуць, што яны падтрымліваюць вайну толькі дзеля абароны свае бацькаўшчыны, але гэтае само цяўпуць і імпэрыалісты,—вінавайцы вайны. Робіцца ўражэнне, што абаронцы, прычыняючыся да вайны, падтрымліваюць сваіх імпэрыялістаў і дапамагаюць ім у іх ваеўнічых заданнях. Інтэрнацыяналісты, наадварот, с самаго пачатку цьвердзяць, што вайна—гэта справа рук шайкі грабежцаў-капіталістаў усіх народнасьцяў і што яе трэба скончыць, ідучы да гэтага шляхам паўстання міжнароднай дэмакратыі проціў буржуазіі, зачаўшай гэтую сусьветную бойню.

Большасьць меньшэвікоў стаіць на грунці абаронцаў, а да інтэрнацыяналістаў прылучаюць сябе большэвікі, частка меньшэвікоў з Мартовым на чале і лівае крыло соцыялістаў-рэвалюцыянэраў. Большэвікі лічаць, што рэвалюцыю учынілі работнікі і селяне, або узброяны пралетарыят, т.-е. салдаты, і, на моцы гэтага, уся ўлада ў дзяржаві павінна перайсьці да іх рук. Толькі дэмакратыя, на іх погляд, здолае стварыць тую аўтарытэтную уладу, каторая патрапіць скончыць вайну, перапыніць безладзе і устанавіць парадак.

Я. Л.

Беларусь і Літва.

[Глядзі № 27]

Найбольшымі гандлёвымі цэнтрамі, каторыя служаць і рынкамі збыту, зьяўляюцца: Вільня, Мінск, Дзьвінск, Вітэбск і Беласток. Вільня, дзякуючы свайму становішчу на раздарожжы, для нікаторых каленіяльных тавароў зьяўляецца цэнтральным гандлёвым пунктам для суседніх районаў. Дзеля характарысьцікі гандлёваго капіталу, можна узяць вылічэнне (учетъ) вэксалёў. У 1908 г. дзяржаўны банк, акцыянэрныя і прыватныя банкі вылічылі вэксалёў на 44 мільёны руб., або на 3 рб. 65 к. на душу і па 163 рб. 54 кап. на 1 квадратн. вярсту. На Беларусі перамогаюць дробныя вэксалі [дробны гандлёвы капітал]. Напрыклад, дзяржаўны банк у 6-і губ. дысконтаваў у 1908 г. 159 тысяч вэксалёў на 22 мільёнаў рб., а ў цэнтральнай Расіі разам з г. Масквою 140 тысяч вэксалёў на 45 мільёнаў рублёў. Гэта надзвычайна яркі прыклад для характарыстыкі жыдоўскаго спосабу гандлю і расійскаго. Для населення першы спосаб гандлю выгоднейшы; каб канкурыраваць з ім, трэба шпарчэй працаваць, выграючы на частых зваротах, а ні вялікім зыскам. Гэтым і тлумачыцца, што на Беларусі многа вылічаецца (учитывается) вэксалёў, бо гандлёвы капітал шпарчэй зварачаецца. Беларусь мае агромністы лік гандлёвай і дробнапрамысловай люднасьці, якою зьяўляюцца жыды нашаго краю. Гандлем талянтуе 38,65% усяго жыдоўскаго населення. Істнуючая канкурэнцыя ні толькі паміж тымі, хто прадае, але і паміж тымі, хто купляе,—напрыклад, на мястэчковых рынках,—рухавасьць жыда-гандляра, яго энэргія і малая патрэбнасьць робяць з жыдоў самых эканамічна выгодных для краю фактораў. Самыя нізначныя, малекія часткі гандлю, дзякуючы гандлёвай здольнасьці жыдоў, хутка арганізуюцца, растуць і робяцца эканэмічна дужымі і моцнымі. Пры істненні гэткай гандлёвай арміі, можна лёгка арганізаваць скупку з усяго краю уселякай драбязы. Есьць яшчэ на Беларусі поўмільённая армія хатніх прамыслоўцаў (шаўцы, краўцы і т. д.); на гэтым грунці Вільня, Вітэбск вядуць аптовы гандаль гатоваю адзежаю са ўсёю Эўропэйскай і Азіяцкай Расіяй. Вільня оптам прадае гатовых вопратак на 2 мільёны руб., і гандлюе гэтым каля 60-і фірмаў. Шыцьцё гатовых вопратак і плацця пастаўлено на амэрыканскі кштал́т,—шаўцы дзеляцца на ісподнікаў, камзэльнікаў, пільчачнікаў і т. д.. Вільня па аптоваму гандлю гатоваю хутраной адзежаю займае адно с першых мейсц у Расіі. Масква і Петраград шыюць многа адзежы на хутры, але для ўласнаго ужытку. Вільня купляе расійскія шкуркі (віёрка, лісіца, каракуль, тхор і інш.) у Н.-Ноўгарадзі на кірмашу, а ў Лейпцыгу—заграінчныя хутры. Каля 200 кушнароў вырабляюць і спываюць шкуркі. Улетку прыезджае многа

угледзіў свае дрожкі, Язэпа і што—вечар.

Ехалі моўчкі. Толькі спытаўся Язэпа, ці усё было добра без яго на фэрмі і ці здаровы дзеці, і зноў маўчаў, пачуваючы, што абурэнне спадае, баліць трошкі галава і бярэ ніздавальненне, на што гаманіў.

Ахінаў с поля зямельны жытні пах. Вялікія стагі сена паілі паветро ароматам. Грады бульбы і буракоў без канца мітусіліся сярод сьціхлых на нач дрэў,—а ні радавалася гаспадарская душа.

— К чаму, на што?—думаў ён ні то аб гэтым багацці наўкола, ні то аб тым, што спрэчаўся:—як ні спрэчайся,—жывець кожны, як жывецца.

І быў пэўны, што нікому ні зьбіць яго з думкі, што трэба вялікім быць і усё парваць.

Жыў ён у Амэрыцы дваццаты год, куды прыехаў шчэ хлопцам разам з Эльзаю, дачкою лесапільшчыка немца, да яе дзядзькі, фэрмера-амэрыканца. Як борзда прабеглі годы! Ажаніўся на Эльзі, дзетак прыждаў, багацця прыдбаў, кіруе усёй фэрмай. Жыцце у Міншчыні, дома у бацькі, і потым на нямецкай лесапілцы у Шульца, ў панском лесі,—усё гэта здавалося цяпер далёкім сном. Ні было каму пісаць лісты і ні было ад каго мець іх. Шульц з Еўні выехаў у Прусію, бацькі паўміралі. Як борзда прабеглі годы!

Блізка фэрмы ішла на спатканне жонка. Завінуўшыся у цёплую пуховую хвустку, стаяла на альлейцы і угледалася на дарогу.

Астанавіліся дрожкі. Балазевіч зьлез. Жонка падбегла і абняла.

— Міленькі! Я выйшла стрэчаць,—прыпала да вуснаў.

— Дзякуй, Эльзачка,—ласкава прыгладзіў ён яе белакурыя валасы, што ніпакорлівымі кручастымі завітушкамі вьбіліся, і падумаў: «А яна усё такая ж лятуценніца ціхая, як і у першыя маладыя годы тут, на чужбіні»,—і пачуўшы нівыразную кукобнасьць да яе, прыемна-далікатна абхапіў за плечы і павёў на ганак.

— Макся! Лёвочка і Галінка пазаснулі, а чакалі, чакалі таты...

У атказ, ён пацалаваў яе у круглыя, галубыя, быц палітыя сьлязьмі і крошку лупаценькія вочы, так ні падобныя да воч іхных вясковых дзеўчат і гэтак зманіўшыя яго там, у Міншчыні.

Стары гаспадар, бязьдзетны дзядзька Эльзы, яшчэ хадзіў па двару, схіліўшыся да свае качарэжкі махрамі трубкі, і прыветна стрэў іх. Роўна паздароўкаўся з ім Максім і дастаў с кішэні апошні нумэр «Der Tag».

— Добра зьездзіў, Макс?—спытаў стары, хаваючы любімую газэту.

— Усё добра,—адказаў і падумаў: «На душы ні надта добра.»

Прайшоў у пакой і пачаў раздзявацца і мыцца. Гукнуў з двара Язэпа і даў новінькую польскую кніжку, а сабе на столік начавы у спальні палажыў «Аб бацькаўшчыні і нацыяналізму» і загадзя запэўняў сябе, што навін там ля сябе ні знайдзе.

За вячэраю, калі селі за стол, стары важна распасьцёр газэту побач талеркі, і відаць было, што яму трэба пагаманіць с пляменнікам аб сусьветных справах.

Гаварылі звычайна па-ангельску, але Эльза да мужа, калі заставаліся адны, гаварыла па-беларуску, быццам даводзячы, што яе душа блізка яму. Яна вырасла на лесапілцы у Еўні і тут, на амэрыканскай фэрмі, часта сумавала і нат тужыла па тэй краіні, ці па сваёй моладасьці.

— Максінька,—часам казала яна,—Бог і з ім, с тым багаццем і с тэй воляю: паедзім назад у Міншчыну.

— Што ты там згубіла?—пытаў ён.

— Макся! Ну, я-ж там узрасла, цябе там пакахала.

— Радзілася ты ў Прусіі, а калі жыла на Беларусі, то вот жывеш і ў Амэрыцы.

— Макся! Ну, то ж твая бацькаўшчына.

Ён ні хацеў спорыць. Казаў: «Пачакай. Стары ні захочэ й слухаць. Яму фэрма даражэй за маю і сваю бацькаўшчыны».

Цяпер за сталом стары, сёрбнуўшы колькі лыжак, хлопнуў нібы раптам, па газэці і завёў сваю любую гутарку аб прынаднасьці фатэрлянда, што найлепшы ёсьць ён сярод імпэрыяў і краёў.

— Я і славянаў люблю,—казаў ён у канцы;—я і славянаў люблю, бо жыў хлапцом у Польшчы і Літве і ведаю. Ды трэба праўду казаць: мягкі народ, дужа ні цьвёрды народ; замнога думаюць аб усім сьвеці, аб небі і ні бяруцца за паляпшэнне свае зямлі... Так.

Максім лічыў лішнім паказываць старому, што ні згаджацца з ім.—«Тупы ты, як даўбня,—думаў ён, схіліўшыся над талеркаю,—самаувэраны неміц. Гдзе ж табе усё абхапіць і зразумець»...

А стары гаманіў:

— У чалавеку павінны быць дзьве роўных часткі: цьвёрдая і мягкая. У немца гэта якраз палавінкі. У другіх народаў—як калі. А ў славяніна мягкая часьць залішне вялікая на кошт цьвёрдай, дужа залішне.

— Эт! Часьці...—ні вытрываў Максім:—у чалавека дзьве часьці: душа і цело. У славяніна дух за цело, і толькі. А пражыцце... Здолеюць некалі і яны жыць практычна, як немцы.

— Не, пане. Неміц і ў Амэрыцы жыве, а душою ён—у фатэрляндзі, у дзедаўшчыні, а славянін...—стары махнуў рукою:—таму усё роўна.

— А славянін бліжэй да вялікаго чалавека, каторы мусіць знайсьці сілы парваць старую зьвязь, базыруючую на інстынктах, на прызвычцы, і шкодную наогул нават бацькаўшчыні, вот!

— Пхе, пане Максіме! Я згаджаюся, што у таго ёсьць трошку вялічэйшаго духу, хто здолеў з беларускіх лапцеў і цемнаты выбрацца у амэрыканскія заможныя фэрмэры і здабыць асьвету. Але ж славянін жыве пачупцём і толькі маркоціцца аб дзедаўшчыні, замест практычнаго нямецкаго клопату. І гутарка яго аб вялікім чалавеку значэ... значэ толь-

купцоў з Расіі і скупляюць хутраныя рэчы. Гандаль адбываецца на 3-4 мільёны рублёў.

Вільня і Мінск вядуць аптовы гандаль на ўсю Расію яшчэ гатовымі, прыгожа пашытымі, абуткамі; у краю маецца вялікі кадр шаўцоў і іх падмайстраў. У Мінску адна гэрманская фірма дапасавала вялікую фабрыку мэханічнай вырабкі абутак. За апошні час земляробство ў краю моцна узрасло і многа палепшылося, дзякуючы земляробскім машынам, прыладам і лепшаму насенню. Раней патрэбы для палепшэння селянскай гаспадаркі здавольвялі Лібава і Варшава, а цяпер у губэрнскіх гарадох маюцца прыватныя фірмы, гандлюючыя с.-гаспадарскімі машынамі, напрыклад: у Вільні—Нагродзкі «Помощь» і Трыльскі у Мінску—«Серп» і др., Нават у мястэчках пашыраецца гэты гандаль, і склады с.-гаспадарскіх машын маюцца у м. Глыбокім і др. Але поруч с прыватнымі фірмамі, гандаль рэчамі, патрэбнымі у с.-гаспадарскім ужытку, вядуць мейсцовыя с.-гаспадарскія гурткі. Так, напрыклад, склад «Виленскаго Общества Сельскаго Хозяйства» мае агуловага гандлю у год на 400 тысяч рублёў. Мінскі Сындыкат [камэрцыйны аддзел пры С.-гаспадаркум гуртку] за 1910 год с 4-ма сваімі аддзеламі у Пінску, Оршы, Бабруйску і Тугановічах прадаў на 452.888 руб., тагды як у 1905 г. было прадано з гэтых складаў усяго толькі на 246 тысяч рублёў. Агулам можна рахаваць, што на Беларусі прадаецца гэтакіх тавараў, як машыны, прылады для с.-гаспадарскаго ужытку, насення, штучных палепшэнняў і інш., на 3 мільёны рублёў. Гэта наводзіць на думку, што ў нашым краю маглі-б істнуваць фабрыкі, каторыя выраблялі-б с.-гаспадарскія прылады, тагды як да гэтага часу яны адтрымліваюцца найбольш з заграніцы.

Табліцы да тэксту. Табліца I—прывоз збожжа у край,—калі лічыць у тысяч пуд:

Губэрні	Збожжа у зерні	мука штан. крупы	Агулам збожжа	ідзе та гарадэ.
Вітэбская	2598	5238	8218	6622
Мінская	1929	3451	7150	3842
Віленская	3469	2315	5980	5597
Гродзенская	2109	2798	5182	—
Магілёўская	1345	2389	4080	—
Ковенская	1229	1619	3290	—

Табліца № 2—вываз збожжа с краю у тысяч. пуд.

Ковенская	2209	760	4410	—
Мінская	1586	709	3282	—
Гродзенская	374	216	2146	—
Магілёўская	233	130	1411	—
Вітэбская	309	518	1255	—
Віленская	339	335	1200	—

Табліца № 3 колькі і якога лесу вывезьлі у 1907 г. у Прусы на Тыльзіцкі рынак:

а) Круглякоў сасновых:			у куб. метрах дрэвяной массы [фэстметр] 733.746 кб. мэт.
бярвенняў	497.854	шт.	
мачтэляў	97.860	,,	
рык	111.504	,,	
паўскробак	212.782	,,	
б) Круглякоў яловых:			536430 кб. мэтр.
бярвенняў	404.187	,,	
мачтэляў	65.218	,,	
рык	50.479	,,	
в) Асіны, алешыны і др.:	147.870	,,	160835 кб. мэтр.
Дубоў	23.587	,,	
Тэлегр. слупоў	32.652	,,	
Падвалаў для шахтаў	54.364	,,	
г) Папіргольцу доўв.	1.366.561	,,	148480 кб. мэт. ахт. 18560 кб. мэт.
д) Чэсаны лес:			
Брусоў	88.640	,,	
Мадэрлат	56.789	,,	
Шпалаў	968.014	,,	
Шведяў сасн.	1.548.760	,,	
,, дуб.	26.492	,,	
,, шведз.	125.627	,,	
Разам	2.814.352	шт.	

А. Уласоў

Ліст с чужыны.

«Я ад вас далека, бацькаўскія гоні,—
На чужое небо я гляджу сягоння.
Але думкай, сэрцам, толькі вас я знаю,—
Як і жыў, жыву я у сваім родным краю.
І німа на сьвеці так вялікай меры,
І німа на сьвеці так каваных дзьвераў,
Каб хоць і на ч сіну, у будні, ці у вядзелі—
Беларусь са мною разлучыць пасьмелі.»

Так жаліцца-кажэ наш слаўны песьняр, Янка Купала. Так жалюцца і другія сыны свайго краю, загнаныя у чужыя землі. Так і я хачу выказаць вам, Браты-Беларусы, свой жаль, каторы агартае мяне на чужой старане. Ні распуста, ні збыткі разагналі нашых «хлебаробаў беззямельных» па усяму сьвету, а паняверка і галыцьба. Гэта ні тое, што нейкі багатыр ад «скукі,» ці праз цікавасьць разьезджае сабе па заграніцах, па курортах. Такі чэлавек ні засумуе па сваём краю, па свaёй хаці,—бо як толькі той «сум» на яго надойдзе, дык ён зараз-жэ можа сесьці ў «экспрэс» і праз колькі гадзін, ці добу—ўжо ў хаці.

Наш брат ні тое. Выгнала яго доля ліхая ў сьвет хлеба шукаці, загнала ў нейкую старонку «за трыдзевяць зямель,» і трымае яго там, як нівольніка, пры варштаці хвабрычным, ці пры лапаці гаспадарскай. Гнецца, працуе. Прыступае к грудзям жаль балючы, як успомніцца родны Нёман, пушча Белавежская, ці гай родны, залёны, ці поле каласістое, ці салавей, ці зязюля... Як успомніцца маці, сястра, бацька стары, ці брат гаротны, як успомніцца родная казка, ці песьня—апусьціць, стоючы за варштатам, інструмэнт з рукою, ці, апершыся аб лапату, голаў апусьціць... Задумаецца... Сэрцо забьецца, сьлёзы надступяць. Але ні сядзеш у «экспрэс,» ні паляціш,—бо тры злоты у кішэні, а дзесяць зьесьці трэба.

Э-эх! І такую-ж багатую, прыгожую душу-нівехну даў Бог чалавеку і такое грэшнае, пакутнае цело! Душа ляціць, душа там, з імі, на родных нівах,—а целам ты тут, у чужых, цело цяжкое, безпомачнае... Вось я жыву цяпер у Крыме, на бэрэзі Чорнага мора. Прырода тут вельмі прыгожая: горы высокія, ажно на іх хмары кладуцца; дрэвы і кветкі чароўных народ вабяць воко і сэрцо; паветро чыстае, здаровае у грудзі бытцым бальзамам уліваецца; моро то звольна, то грозна шэпча і гамоніць з скелямі ці плыткім бэрэгам. Жывеш тут у летку і здаецца табе, што гэта сон ці казка. На душы лёгка. Ляжэш на бэрэзі мора, купаешся. Сонцо, як спрыцам улівае у цело, праз саўсім ужо пачарнеўшую, як у нэгра, скуру, свае жыватварныя сілы. Ляжыш, усьміхаешся. Глядзіш у небо,-яно такое чыстае, чыстае, як моро. Толькі моро шуміць без прэстанку хоць і лёгкімі хвалькамі коціцца па каменьчыках, а небо ціхае і спакойнае. Вось выплывае хмарка беленькая; расплываецца і адбівае розныя вобразы. Тагды успамінаецца, як пастушком яшчэ лежаў так сама у полі і глядзеў на хмаркі. Каля мяне хадзілі кароўкі і чутно было, як чамкалі і жэвалі траву. Падняўшыся, здаецца, пад тыя хмаркі, пяе жаваронак. Далей, у гаі, куе зязюля. Прыходзіць да мяне маці. прыносіць гасьцінец, што бацька толькі што з гораду прывёз: кніжку з малюнкамі і губную гармоніку. Я дзякаваў, а маці прытуліла мянэ да грудзей і трымала доўга, доўга, аж но пасьля я пачуў, як закапалі яе сьлёзы па маім твары, у губы трапілі, салоныя такія... Вось, як марская вада, салоныя... А людзі нат кажуць, што моро,—гэта сьлёзы пакрыўджэных, бо земля іх ні прыймае і яны ні высыхаюць і зьбегаюцца ў вадно вялікае моро.

— Доўга,—казала мне маці,—жыць ты будзеш. сынок. —Я лічыла як зязюля цяпер кувала. Доўга будзеш жыць. Толькі ні спакойна я, што шчасьліў ты будзеш. Я памру скора, а людзі мацерью табе ні стануць... І праўда. Хвала табе Божэ—з пятнацаці гадоў—пайшоў я, як кажуць, у людзі, а досі людзей ні бачыў... Ганяючыся за хлебам, я абьехаў поўсьвета. Усюды людзі чужымі былі мне. А часта заскрэбе на сэрцы той смутак па мацеры, па бацьку, ці па зязюлі, што многа гадоў накувала... Сьцісьне грудзі боль глухая, забьецца сэрцо ў адзіноці. Ні міла становіцца мне на бэрэзі мора. —Ні міла сонцо на чужой зямлі. Бо там, на Беларусі, дзе пяюць салаўі, куюць зязюлі, шуміць бор. ўецца Нёман,—там, на маёй бацькаўшчыні—стогнуць людзі, плачуць песьні... Там цёмныя ворагі народнаго адраджэння сеюць свае насенне злыбеды, цемры і зьдзекаў.

Гісторыя Беларусі—гэта кніга белая, чыстая, з вогненымі літэрамі і без крывавых плям. Культура яе была багатай, язык беларускі быў языком гасударственым на Літве, як цяпер расійскі у Расіі. А нічога гэтаго ні маем цяпер толькі таму, што мы былі праўдзівымі людзьмі, порахам і шабляй ні заваёўвалі таго,

кі тое, што туга па бацькаўшчыні пачынае выліваць з берагоў і зараз паганіць яго з Амэрыкі... Ха! Не?

Максім чырванеў. Эльза бачыла, што стары любіць яго, а ні спадзяецца на яго славянскую натуру і загадзя забегае у тыл яму, каб ні ўцёк, і баялася, каб ні натта балюча было мужу, і пачынала заварачываць бяседу на іншыя размовы.

Сёдні, калі Максім ужо у спальні цалаваў сонных дзетак. яна шчытна абхапіла яго за шыю і пачала:

— Максінька, даражэнькі, залаценькі! Мы паедзім на Беларусь, паедзім. Ніхай стары спакойна дажыве,—паедзім. Лесапілку пабудуем, і хаця нівялічкі такі хвальварчак на пасэсію возьмім. Я тут нуджуся.. А там мы... там я навучу вясковых дзеўчат гарадзкія спаднічкі насіць, шыць, навучу прыгожыя прычоскі рабіць. А ў сьвяты дзень—гармонік, скокі, танок. Макся, міленькі мой! я прашу цябе: паедзім. Я ні ганю цябе за твае гутаркі... Я ведаю, чаго думаіш ты аб вялікім чалавеку. Я спагадаю табе... Толькі жыцце някак ні спрые таму.

— Эльця! І ты, дарагая, ні знаючы, празрыста адбіваіш уплыў дзядзькінай самотнасьці,—казаў нізадаволенна Максім; — ты кажыш без паважнасьці. Ніўжо ты думаіш аба мне, як дзядзька? Памыляецяся вы абое. Я ведаю, што раблю, — троху заздуваў дайжэ ён:—я патраплю ськінуць усякія ланцугі з волі, хаця б гэтыя ланцугі былі — балесныя згукі бацькаўшчыны. Чалавек шмат навыдумляў ланцугоў і пут! Павіннасьць да бацькаўшчыны, ха... Я перш за ўсё волян хачу быць сам у сабе ад усякіх людзкіх пут. Я патраплю парваць іх. Чуіш, Эльза!—строга зьвярнуўся ён:—заўтра ж забараніць Язэпу і Монці гаварыць з Лёвай і Галяй па-беларуску. Адна прашкода—добра вучыцца па-ангельску. Я амэрыканіц і яны—амэрыканскія дзеці...

— Макся!..

— Спаць хочу.

З дарогі борзда заснуў пан Балаевіч.

«...Вечар. Цёмна. Ен прыехаў с поля. Сядзіць у хаці на калодачцы і разуваіцца. Цело ныіць і просіць адпачынку. Вобуў мокры.

— Адарка!—кажыць ён Эльзі, трудна пазнаючы яе у растоптаных лапцёх, горкай ат пылу і поту кашулі і абшарпанай, нескладнай спадніці.—Адарка, пасушы мой вобуў.

У хаці чаўкае аграмадны іоркшыр мешанку... Лыч відочна расьце у яго доўгім і войстрым: дыбіцца шчэць на гарбу. Які там іоркшыр! проста нашская свіння, што сьвінней-кракадзілам амэрыканцы завуць.

— Максім!—кажэ Адарка мужу хрыплым, прастудным голасам,—ня-го ты сьлеп, хоць бы якую асіну з лесу зьвёз, жолаб выдаўбаў; зірні—уся жыжка выцекае, калі гэтыя сьвіначкі, ваўкі іх парэж, усё з нагамі ды з нагамі у яду.

Выцягнула Адарка гаршкі с печы і цугун з вадою. Пачала крупеню падліваць. Пар заслаў усю убогую хату. Дзеці—Лёўка у лапленых даматкавых штоніках на матузках, с цынкамі на нагах, і Галя замурзаная, худзенькая, у кашулёнцы, як луб атзаді,—лезуць да гаршкоў. просючы у маткі крупенькі забяліць.

— Дай ім,—кажэ добра-спакойна Максім.

— Трасцы ім!—ірвець сэрцо Адарка сваім крыкам.—Зьядуць і без пастаялкі.

Ен паехаў у панскі лес у дровы. Насек. Вязець. Конь абмёрз дробнай шэранню.—Но, но!—памагае яму у варотах, гдзе цяжка узьвезць.—Во й бацька прыехаў,—чуцен голас Адаркі.—Тата, тата!!—галосюць дзеці. гайцаючы па лаўцы с печы да вакня. А на лаўцы навалено, як пападзя; шапка, жупан, міска з ложкамі, шкумапцэ. Атхіснулась ад крука у сьпяне Галінка, перaступаючы крывымі ножкамі цераз жупам на лаўцы. —Ай!!—крыкнуў Максім: атшаснулась дзяўчонка і паляцела з міскаю, с чаронкамі, з жупаном на дол. — Максім! Галена забілася... —ірвець сэрцо Адарка сваім прастудным, злым крыкам...»

— Макся! Максінька! Прачніся. Што ты крычыш праз сон?—трывожна гладзіць яго Эльзачка пухлаю рукою па гарачай шчацэ. І ён прачыхаіцца перапалоханы, з мокрым лбом і стукаючым сэрцам.

— Ух!—цяжка а с палягчэннем радасьці уздыхае ён і ловіць мягкую ручку Эльзы на сухіх губах і прыжымае. І цягне яе, дарагую і спагадаючую, усю да сябе, да грудзей.

— Макся! Ты бачыў кепскі сон?—пытаіць яна, узглёгшыся на грудзі і цалуючы яго у мокрыя валасы на ілбу.

— Эльзачка, дарагая! Жоначка мая любая,—гаварыў ён, і раптам ярка і ясна с цемнаты успомінаючы той сон,—красачка мая, Эльзінька...

І яна чула, як дрыжэлі яго рукі і што яму робіцца халодна.

Легла з ім побач, завінула яго, прытулілася да яго, палажыла яго руку сабе пад голаў. Гладзіла яго твар нежна і дэлікатна і шэптала яму:

— Макся мой, саколік мой! Што нам быць гордымі і вялікімі. Будзем, якімі будзецца. Паедзім у Мінщчыну, заарэндуім фальварачак. Лёву і Галю будзем вучыць. Будзем працаваць. Ты навучыш хлапцоў лепяй гаспадарыць і... насіць пiджакі і галстухі па-амэрыканску. Я навучу дзяўчынак шыць плацці на эўропейскі лад і стужкі ўплетаць у валасы прыгожымі бантамі. Па сьвятых днёх будзем хадзіць у царкву, потым пойдзем туды, гдзе скокі, музыка, бяседа... Пабудуем каменную хату і млын с паравічком. Будзем жыць!

Цішэй дыхаў Максім.

— Чуіш, Максінька мой даражэнькі. Максічка залаценькі?

Ен пачуваў, што ні меў і ні маіць нейкаго цьвердаго падмуроўку, і прыціхаў у жальбе пад словы ласкі і любосьці.

Гжацк. 7/хі—16. М. Гарэцкі.

№ 4 БЕЛАРУСЫ-ВОІНЫ ЗАХОДНЯГА ФРОНТУ! НА ВЫБОРАХ ДА УСТАНОУЧАГО СОЙМУ ГАЛАСУЙЦЕ ЗА СВОЙ СЬПІСАК № 4

што нам было трэба. Мы верылі, што чалавек ёсьць—чалавек. Ой, цяжка мне тут, на берэзі мора. Я чую, як там на бацькаўшчыні ідзе гарачая работа на грунці спраў роднага, дарагога народу. Я знаю, як с карэннем вырываюць засеяныя ворагам плевелы цемры і зьдзеку. Я бачу, як віволнік-чалавёк пачынае ажываць і на твары яго загарэліся румяны. Бачу і хачу птушкай ляцець да вас. Браты Беларусы! Чалавек, як малады арол у ніволі, усё-ж набіраецца сілы і вырастаюць крылля. Там, пад небам яго стыхіі і ён упячэ, паляціць! Крылля вырастуць і сіла будзе! І ніякая ніволя ні падточыць сілы душы! Ніхто ні здолае падрэзаць крылляў душы! Паразганяные доляй—нідоляй па усіх куткох сьвета, як адзін, зьедуцца на родную зямлю шчырые сыны зямлі Беларускай. І свае сілы аддадуць сваім.

І. Пілінаў.

ПА БЕЛАРУСІ.

Нацыянальны рух селян Пустынскай вол.

(Дрысенскі пав. Віт. г.) Між разлеглых на шырокім абшары узгоркаў, бароў і дуброваў, паміж шумлівых, звонкіх ручайкоў, на ніўраджайнай мацізямельцы беларускай разлажыліся, як падарожныя цыганы, нізкія шэрыя вёскі гаспадароў Пустынскай валасьці.

Калі глянуць здалёк на валадыроў гэтых хатак з іх бедным скарбам, ніколі ні падумаеш, што тут падымаецца нацыянальная сьвядомасьць, будзіцца векамі прыціснутая нацыянальная душа беларуса. Але, угледзіўшыся бліжэй, бачым, што і тут, ў гэтай закінутай глушы, засьвяціла новая заранка вольнасьці лакрыўджанаго беларускаго народу.

29 верасьня, на сьвятога Міхаіла, селяне Пустынскай вол. сьвяткавалі сваё нацыянальнае сьвято, якога даўно ні відзелі, даўно ні адчувалі у сваіх думах.

У гэты самы дзень выбраныя валасьцій грамадзяне у земствы сабраліся у будынку валасьці і адчынілі першае земскае сабранне пустынскаго валаснога земства.

Адчыніў сабранне земства старшыня выбірацельнай камісіі, мейсцовы міравы судзьдзя N., сказаўшы прамову па-беларуску, у якой адзначыў, што толькі цяпер мы пачуліся гаспадарамі у сваей старонцэ і можэм гаварыць у свайей роднай мові, над якой зьдзекаваліся і выганялі пры царскім панаванні з усіх грамадзянскіх устаноў 10-ці мільённаго беларускаго народу. Даляй ён абрысаваў у прамові жыццё Беларусі пад панаваннем Польшчы і расійскага самадзяржавія.

А пасьля прамовы N было прыступляно да парадку дня. Першым пытаннем было пастаўлено абранне старшыні земскаго сабрання на ўвесь год. Амаль ні усім сабраннем быў пададзен голас за І. С.—сьвядомаго і шчыраго прыхільніка беларускаго руху, а падстаршывём выбран М. Алачыш. Даляй была выбрана управа і члены усякіх камітэтаў.

Калі дайшла чарга разглядзіць школьнае пытанне, то была вынесена рэзолюцыя аб перамені пачатковай школы з расійскай на беларускую, с тлумачэннем вучням роднай беларускай мовай з гэтаго-ж году па усіх школах Пустынскай валасьці, была пакінута толькі адна расійская школа для тутэйшых вялікарусаў—старавераў, якіх тут ні больш за 20 сэліб на усёй валасьці.

Усе, выступаўшыя на сабранні с прамовамі, гаварылі толькі па-беларуску.

У гэты-ж самы дзень у Пустынскім касьцёлі, перад імшой, хор прапеяў сьвятыя беларускія песьні: «О, мой Божэ! веру Табе...», а посьля набажэнства ксёндз да сваіх пархвіян зьвярнуўся с казаннем у беларускай мові. У Пустынскім сяле гэтым днём адбыўся вялікі кірмаш.

Так селяне Пустынскай валасьці пачынаюць тварыць сваё ўласнае нацыянальнае жыццё, сваю лепшую будучыну. І на гэтай дарозі Пустынскіх селян ні стрымае ніякая моц, бо толькі гэтым шляхам беларускі народ прыдзе да шчасьлівых, сьветлых дзён!

Ніхай-жа ведаюць тыя выродкі, каторыя адракліся, адчураліся усяго свайго роднаго, высьмешнікі над сваімі роднымі бацькамі, шальмуючые думку беларускаго адраджэння, што беларускі народ ні загіне, а памаленьку зломіць усякія прашкоды на свайей дарозі і створыць са сваімі шчырымі прыхільнікамі сваё сьветлае нацыянальнае і сацыяльнае жыццё.

М.

АПОШНІЯ НАВІНЫ.

Радзіотэлеграма с Петраграду. Маскоўскія газэты надрукавалі такую радзіотэлеграму с Петраграду: «Войско Керэнскаго разбіто. Арыштован штаб Керэнскаго з генерал. Красновым і Войцінскім на чале. Керэнскі, перапрануўшыся у матроскую вопратку, уцёк. Казакі, перашоўшы на бок рэвалюцыйнаго войска, шукаюць Керэнскаго, каб выдаць яго у рукі ваенна-рэвалюцыйнаго камітэту. Аванцюру Керэнскаго можна лічыць ліквідованаю. Рэвалюцыя торжэствуе. Чэсьць арэшта штабу Керэнскаго належыць матросу Дыбенку». Радзіотэлеграма падпісана: За глаўнакамандуючаго: Антонов. За начальніка штабу: В. Бонч-Бруевіч.

Ленін і дзяржаўны банк. С Петраграду паведамляюць, што Ленін прыслаў у дзяржаўны банк ордэр на 1 мільён рублёў для патрэб ваенна-рэвалюцыйнаго камітэту. Грошай яму ні выдалі. Служачыя кінулі банк, які цяпер вартуе старая варта і ватага большэвікоў.

У Кіеві. Цэнтральная Украінская Рада абвесьціла, што яна зьяўляецца ядынаю правамоцнаю уладай на Украіні. Большэвікі 6-га лістапада паслалі радзіотэлеграму у Раду народных камісароў у Петраградзі гэтакаго зьместу: «дружным націскам большэвіцкіх і украінскіх войск і узброеных чырвонагвардыйцаў адтрымана пабеда; у нас забітых і раненых 9, у іх—400».

Аўтаномія Бэсарабіі. З Кіева паведамляюць, што малдаванскі вайсковы зьезд абвесьціў нацыянальна-тэрыторыяльную аўтаномію Бэсарабіі с тым, што будзе споўняць яе рэвалюцыйным спосабам; на чарзе стаіць справа нацыяналізацыі арміі і арганізацыя вышэйшае улады.

Упэўнянасьць у сабе Керэнскаго. Перадаюць, што за апошні час Керэнскі быў натта высокае думкі на конта свайго уплыву і араторскай здольнасьці. Напрыклад, ён хваліўся, што досыць яму зьявіцца і прамовіць слоў колькі да салдат, каб салдаты пайшлі за ім і забылі пра большэвікоў і Троцкаго. Дзе—хто заўважвае, што Керэнскі занідужаў на грунці пераоцэнкі сваіх сіл. Калі яму за дзён колькі раілі зьвярнуць увагу на тое, што робіцца навокала, то ён казаў, што стоіць яму «паварушыць пальцамі» і ад большэвікоў «застанецца пустое мейсцо».

Маскоўскія падзеі. Большэвіцкая стрэляніна пашкодзіла Успенскому Чудаваму монастыру і іншым будынкам. Адна бомба трапіла у будынак меськай думы, але значнай шкоды ні зрабіла. Павыбівано многа вокан і папсованы муры. На пачатку вайны пачалі уцякаць з Масквы. Дзе-хто пакінуў Маскву назаўсюды.

Петраградскія падзеі. Рожніца паміж падзеямі 3-4 ліпня і цяперашнімі тая, што тагды да паўстання большэвікоў больш прычыняліся рабочыя, а цяпер салдаты і матросы. Паўстанне можна сьмела назваць вайскова-прэторыянскім. Зімовы палац абстрэліваўся, але страты нівялікія. Былі грабункі гістарычнаго дабра.

Тэлеграпнае агенство ў Маскве ні дае тэлеграм газэтам. Усе служачыя пакінулі агенство, ні хочучы працаваць з большэвікамі. Ва усіх дзяржаўных інстытуцыях пануе саботаж. Большэвікі пагражаюць чыноўнікам звольненням с пасадаў і адпраўкаю на фронт, але пагрозы ні палохаюць.

У Петраградзі. Паведамляюць, што французскае пасольство гатуецца пакінуць Петраград.

Кіраўнічы міністэрствам харчавання паведамляе, што падвоз харчоў моцна паменшыўся і насяленню награжае голад. Ен зьнімае с сябе адпаведальнасьць.

У Мінску. Па загаду ваенна-рэвалюцыйнаго камітэту (большэвіцкаго) арыштован у свайей кватэры камісар заходняго фронту В. Жданоў. Гарадзкая Дума протэставала.

У Мінску гэтак сама улада перайшла да большэвікоў. Ваенна-рэвалюцыйны камітэт вытрэбаваў у Мінск 3 броніраваных аўтамобілі. Па тратуарах сланяюцца салдаты с штыкамі, але у горадзі спакойна. Польскія войска, што стаяць у Мінску, заявілі, што яны трымаюць нэйтралітэт, але будуць бараніць мірных людзей ад нібезпекі.

6-га лістападу толькі што абраны губэрнскі камісар І. Метлін злажыў сваё поўнамоцтво. Гэтае самае зрабіў і памоцнік губ. камісара К. Дэмідзецкі-Дэмідовіч і уся калегія камісароў. Усе справы камісарыяту перадавы часова мінскаму паветовому камісару Міхельсону.

Такім чынам, на Міншчыні цяпер німа ніякай губэрнскай уласьці. Абраць новаго камісара трудно, бо і губ. «Совѣтъ», маючы право на абранне камісараў, падаў у адстаўку.

Тым часам, ваенна-рэвалюцыйны камітэт прызначыў сваіх камісараў: С. Бернсон—па справам зносін з арганізацыямі і установамі; па справам ваенным і гарнізону г. Мінска—Я. Кольмановіч, пры штабі фронту—С. Шчукін.

Генэрал Балуев паведаміў, што ён прызнае уласьць ваенна-рэвалюцыйнаго камітэту заходняго фронту.

Петраград, 6-е лістапада. За ўчорашні дзень ніякіх перамен у агульным становішчу не адбылося. Калі перагаворы на конта ядынай сацыялістычнай уласьці ні будуць скончаны на 6-е лістапада, то можна чакаць пачатку усерасійскай ж.-д. і п.-т. забастоўкі. У Радзі Народных Камісароў (большэвіцкі урад) крызіс цягнецца. З арміі надыходзяць сумныя весткі аб нідахвату хлеба.

Армейскія камітэты згуртавалі над Петраградам каля корпусу войска. Яны дамагаюцца дасягнення згоды паміж ваюючымі старонамі і ідуць проці большэвіцкай дыктатуры.

Пра Керэнскаго. У Ц. К. партыі с.-р. адтрыманы весткі, што А. Керэнскі жыў, здароў і знаходзіцца у поўным захаванні. Мейсцо яго прэбывання трымаецца покі што у сэкрэці.

Мінская Гарадзкая Дума. 6-го лістапада на думскае пасядзэнне прышло шмат публікі. Гласныя былі ў поўным зборы. Развяжаўся бягучы момэнт, падзеі апошняго часу цікавілі усіх. Старшыня Думы А. И. Вайнштэйн робіць даклад аб рабоці Камітэту Спасенія Рэвалюцыі. Камітэт працаваў апошнімі днямі натта інтэнсіўна. Згода паміж Камітэтам і С.-Р. и С. Д. была нішчырая. Прэдстаўнікі Рады р. і с. д. ні раздзялялі пагляду большасьці камітэту і стараліся гэта падкрэсьліваць. Умовы захавання нэйтралітэту выпоўняліся строга: войско с заход. фронту ні пасылалося ні на Петроград ні на падпамогу большэвікам, але К-т ні мог супыніць перавозкі войск на Петраград з другіх фронтаў. Затым паўстаў конфлікт на другом грунці. Большэвікі, 27-го кастрычніка захапіўшу уладу, забралі гэтак само і аружжо і ні гледзючы на патрэбованне К-ту, адмовіліся вярнуць яго назад. Большэвікі заявілі, што калі хто паважыцца прымусам адабраць у іх аружжо, дык «Минскъ будетъ сметенъ артилеріей». Посьля гэтага большэвікі кінулі камітэт с тым, каб зноў захапіць уласьць. Камітэт увесь час трымаецца пагляду згоднасьці паміж дэмакрт. соц. элемэнтамі і ні перашкаджаў большэвікам, асьцерагаючыся выклікаць да змагання войско с фронту і тым німінуча распачаць грамадзянскую вайну. Чыннасьць Камітэта, разумеецца, аслабла і К-т як-бы перастаў істнуваць. Але К-т ні лічыць сябе зачыняным, бо спадзяецца, што крызіс ні можа доўга цягнуцца і ні сягоння-заўтра зьявіцца патрэбнасьць у аўтарытэтным органі дзеля організацыі мейсцовай улады. Такім органам можа стаць К-т Ратунку Рэвалюцыі [К-т Спасенія Рэвалюціи]. Нарэсьці старшыня Думы тлумачыць гісторыю з бліндіраваным цягніком, што стаіць на ст. Александр. ж. д. у Мінску. Паруч. Колотухін, указываючы дарогу, выпоўняў загад К-ту Ратунку Рэволюцыі, каторы хацеў ні пусьціць гэтага цягніка ў Мінск, бо адны чуткі пра гэты цягнік перапалохалі усе насяленне гораду. «Совѣт» ні меў права арыштаваць Колотухіна, а то павінен бы арыштаваць увесь Камітэт і прэдстаўнікоў городу» Дума протэстуе проці учынкаў большэвікоў.

Пагромы ў паветах. Надыходзяць весткі с паветаў Міншчыні і фронту з вялікіх парубках лесу і разгромах хвальбаркаў. Усе лясы, хвальбаркі панскія, монаст. і казённыя землі абвешчаюцца нацыянальнаю уласнасцю, і ваенна-рэвалюцыйны камітэт (большэвіцкі) абвешчае, што нішчэнне і псаванне народнаго скарбу будзе карацца, як злачынство проці народу.

ВАЙНА.

Расійскі фронт. На расійскім фронці за ўвесь час паўстання, з 24-го кастрычніка па 7-е лістапада ніякіх баёў ні было, калі ні лічыць таго здарэння, што с першых дзён паўстання немцы учынілі нівялікі наступ пад Барановічамі і забралі пярэднія нашыя акопы. Траплялося братанне паміж салдатамі на Дзьвінскім і іншых напрамках, але пастаянна перапынялося нашым артылерыйскім агнём

Італійскі фронт. Значныя перамены адбыліся на італійскім фронці. Там аўст.-гэрманцы забралі шмат італійскай зямлі і, паміж іншым, занялі багаты горад Вэнэцыю і ўсю вэнэцыянскую правінцыю. Гэтым гэрманцы учынілі вялікі маральны удар італійскаму народу. Кажуць, што гэрманцы забіраюць сваё войска з расійскаго фронту і тым павялічваюць сваю сілу на італійскім фронці. Па астатнім весткам італійцы адступаюць на фронці па 200 вёрст у шыркі.

Аўст.-гэрманцы захапілі у Італіі за два тыдні 200.000 палонных, 1.300 гармат, а гэтак само вялікую здобыч, якую нават ні можна перавезьці.

Але астатнімі днямі становішчо італійцаў палепшало. Усе атакі немцаў адбіты. Апошнімі днямі італійцы захапілі ў палон 51 афіцэраў, 1212 салд. і 27 кулемётаў.

Расійскі фронт. Ад 7—13 лістапада была на усіх фронтах звычайная перастрэлка. На паўночным фронці партыі супраціўніка намагаліся распачаць братанне, але стрэліся з нашым ружэйным агнём.

Празамірэнне. Новы расійскі урад прапанаваў немцам зрабіць замірэнне. На гэта прэдстаўнікі саюзных дзяржаваў пры Стаўцы заявілі прэтэст проціў таго што расійцы ломяць дагавор з імі і зазначаюць, што сэпаратны мір з Гэрманіяй выкліча для Расіі самыя цяжкія стасункі з іх хаўрусьнікамі.

Рэдактар Я. Лёсік.

Выдавец «Т-во Беларускай Культуры»

Друкарня Н. М. Нахумова (старэйшаго)